**Булатая В.Ю.**

# АДМЕТНАСЦІ ЧАСОПІСА “ДА ЗЛУЧЭНЬНЯ!” ЯК КРЫНІЦЫ ПА ВЫВУЧЭННІ РАСПАЎСЮДЖАННЯ НЕАЎНІІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

*Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, неаўнія, Антон Неманцэвіч, прэса, “Да Злучэньня!”.*

У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі прадстаўнікі розных канфесій і царкоўных рухаў выдавалі шэраг беларускамоўных перыядычных выданняў. Галоўная мэта выдавецкай дзейнасці – трансляцыя поглядаў выдаўцоў на палітычныя, грамадскія і рэлігійныя падзеі. Сярод міжваеннай прэсы адметнае месца займаў часопіс «Да Злучэньня!», які выходзіў пад патранажам Усходняй місіі айцоў-езуітаў.

Часопіс «Да Злучэньня!» – адзінае ўніяцкае беларускамоўнае выданне, якое распаўсюджвалася ў міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі (выдавалася ў перыяд з 1932 па 1937 гг.). Рэдагаваўся часопіс уніяцкім святаром Антонам Неманцэвічам (1893–1943), перыядычнасць выхаду нумароў – раз на месяц. З 1932 па 1937 гг. выйшла 30 нумароў. Вакол выдання гуртаваліся ўніяцкія святары і рыма-каталіцкае духавенства, якое падтрымлівала ідэю ўніі. У 1937 г. выхад часопіса быў спынены праз забарону яго выдання польскімі ўладамі [10, с. 436]. Галоўная мэта часопіса – распаўсюджванне сярод беларусаў ідэй царкоўнай еднасці [1, с. 26]. Змест часопіса з’яўляецца важнай крыніцай па вывучэнні акалічнасцей працэсу распаўсюджвання неаўніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Як адзначалася вышэй, часопіс «Да Злучэньня!» мае свае адметнасці на фоне іншых беларускамоўных выданняў з канфесійным кантэнтам.

Па-першае, часопіс «Да Злучэньня!» можна аднесці да класічнага канфесійнага выдання, што істотна адрознівае дадзены часопіс ад іншых беларускамоўных выданняў эпохі, якія выпускаліся рэлігійнымі дзеячамі. Прадстаўнікі каталіцкіх і праваслаўных рухаў, у асноўным, публікавалі шмат палітычных матэрыялаў, чым прaследавалі мэту – даць сваю ацэнку грамадска-палітычным падзеям, якія адбываліся ў Другой Рэчы Паспалітай. Выбраная намі класіфікацыя часопіса «Да Злучэньня!» абумоўлена наступнымі чыннікамі:

1) самаідэнтыфікацыя выдання: на тытульнай старонцы адразу пазначаўся яго тып – «рэлігійная часопісь» [2, с. 1]. Вызначаны рэдакцыяй тып выдання не мяняўся цягам усяго перыяду выхаду часопіса;

2) выдавецкім органам часопіса было рэлігійнае аб’яднанне «Выдавецтва Таварыства Ісусавага». Акрэсленае выдавецтва дзейнічала пры беларускіх айцах-езуітах Усходняй місіі, якія адказвалі за праект распаўсюджання неаўніі ў міжвенны час;

3) мэтавая аўдыторыя часопіса – уніяцкія вернікі і духавенства. Акрамя таго, рэдакцыя публікавала матэрыялы, якія мелі місіянерскі характар, накіраваны на прадстаўнікоў рыма-каталіцкай і праваслаўнай канфесіі, неабыякавых да ідэі пашырэння новай уніі;

4) рэдактар выдання А. Неманцэвіч у сваіх аўтарскіх артыкулах на працягу ўсяго тэрміну выхаду часопісу паўтараў і падкрэсліваў тэзіс аб рэлігійным характары выдання. Па яго словах, «наша часопісь рэлігійная і мэтай нашай ёсьць справа рэлігійнага злучэньня Беларускага народу [2, с. 3]»;

5) тэматычнае напаўненне, кантэнт і рубрыкі выдання сведчылі аб яго канфесійнай скіраванасці. У змесце часопіса можна вылучыць такія раздзелы, як казанні, урыўкі з Евангелля, катэхітычныя матэрыялы для дзяцей, навіны з уніяцкіх

прыходаў і семінарый, дагматычныя, палемічныя і гістарычныя артыкулы і г.д., накіраваныя на папулярызацыю царкоўнай ўніі сярод беларусаў.

Другая вылучаная намі асаблівасць часопіса «Да Злучэньня!» – мэта яго выхаду. Паводле выдаўцоў, мэта існавання і распаўсюджання іх друкаванага органу «ёсьць справа рэлігійнага злучэньня Беларускага народу [2, с. 3]». А. Неманцэвіч ў праграмным артыкуле часопіса дакладна сфармуляваў мэту яго існавання: «Вось, браты Беларусы, дзеля таго, каб служыць гэтай сьвятой справе, справе нашай рэлігійнай еднасьці і каб бараніць яе ад напасьцяў нашых непрыхільнікаў, мы і закладаем нашу часопісь «Да Злучэньня!», ды заклікаем усіх людзей добрай волі да Сьвятога Апостальства ў гэтым-жа кірунку [2, с. 3]».

Галоўную праблему беларускага грамадства ў міжваенны час прыхільнікі неаўніі бачылі ў адсутнасці яго кансалідацыі: «Няма ў Беларусаў еднасьці рэлігійнай, няма гэтай еднасьці і грамадзкай і гэта ёсьць найвялікшае няшчасьце для народу [2, с. 2]». Аўтары крытыкавалі тэму штучнага падзелу беларусаў на «рускіх» і «палякаў» паводле іх веравызнання. На старонках часопісу публікаваліся матэрыялы, дзе развейваліся стэрэатыпы адносна таго, што каталіцызм – гэта «польская» вера, а праваслаўе – «руская» [2, с. 3; 3, с. 6].

Адпаведнае выйсце са стану дэзынтэграцыі беларусаў прыхільнікі ўніі бачылі ў рэлігійным злучэнні хрысціян розных канфесій: «Часопісь уніятаў «Да Злучэньня!» ўсіх кліча да аднаго неразлучнага адзінства, да адзінай, сьвятой, апостальскай, кафолічнай або сусьветнай царквы [5, с. 10]». Гэтая ідэя вылучае і адрознівае часопіс на фоне іншай беларускамоўнай прэсы рэлігійнай скіраванасці, якая трансліравала ідэі нацыянальнага і палітычнага аб'яднання беларусаў. Уніяты лічылі, што грамадская і палітычная кансалідацыя – другасныя рэчы, якія выцякалі з рэлігійнага аб'яднання: «Разам з злучэньнем рэлігійным хутчэй наступіць у Беларусаў і чаканая лучнасьць грамадзкая, як дадатак, бо сам Хрыстос гэта запэўніў кажучы: «Шукайце насамперш Каралеўства Божага і Ягонай справядлівасьці, а ўся рэшта дадасца вам», таксама унія – справа рэлігійная [6, с. 13]».

Трэцяя асаблівасць зместу часопіса – спецыфіка разумення ўмоў аб'яднання вернікаў. Прыхільнікі неаўніі ўспрымалі ўнію як магчымасць яднання хрысціян розных канфесій у Заходняй Беларусі. Аўтары падкрэслівалі, што само значэнне слова «унія» – гэта еднасць [3, с. 3]. Яны заклікалі беларусаў да злучэння, вяртанне ў лона адной Царквы, як гэта было да вялікай схізмы [3, с. 11; 5, с. 10].

Аднак для таго, каб гэтае злучэнне сталася магчымым, была важная умова: прызнанне Каталіцкай Царквы як адзінай Святой і Апостальскай. Галоўная ўмова злучэння і адзінства хрысціян, на думку прыхільнікаў уніі, – падпарадкаванне Царквы Папе Рымскаму [2, с. 4; 4, с. 17]. Аўтары даносілі тэзіс, што падзел Царквы на каталіцкую і праваслаўную памылковы, на іх думку, Праваслаўная Царква ашукалася. З гэтай прычыны, праваслаўных вернікаў яны назвалі «незлучанымі», а ўніятаў – «злучанымі праваслаўнымі» [3, с. 12; 9 с. 15].

Пратэстанцкую ж царкву аўтары наогул не ўспрымалі як хрысціянскую канфесію [7, с. 12]. Розныя галіны пратэстантызму яны называлі «сэктамі» і лічылі ворагамі, якія перашкаджалі хрысціянскаму злучэнню [5, с. 10]. Лічылася, што ўсе, хто быў далучаны да пратэстанцкіх веравызнанняў, заблукалі: «Браты хрысьціяне, заблудзіўшыя ў розных сэктах і адшчапленьнях, шукайце праўды, імкніцеся да злучэньня, а Госпад Бог нам паможа і вызваліць нас ад усякага сумніву і духоўнага неспакою» [5, с. 11]. Пратэстанты – «ашуканцы, усе служаць не Хрысту, а пеклу, усіх трэба сьцерагчыся горш як агню, бо агонь толькі цела прыпячэ, а яны завядуць нашу душу да пекла, дзе будзе пячыся без канца» [4, с. 18].

Апошняя, чацвёртая адметнасць выдання «Да Злучэньня!» заключаецца ў тым, што рэдакцыя часопіса часта ўступала ў палеміку з прадстаўнікамі рыма-каталіцтва і праваслаўя адносна пытання распаўсюджання неаўніі. Для вядзенне дыялогу з іншымі канфесіямі, у тым ліку палемічнага характару, у часопісе была рубрыка «Наш адказ». За развіццём унійнага праекту ў Заходняй Беларусі пільна сачылі праваслаўныя і каталіцкія актывісты, яны давалі свае ацэнкі і прагнозы гэтай з'яве на старонках уласных друкаваных выданняў. Зачэпліваючы пэўныя тэзісы, аўтары «Да Злучэньня!» не абміналі магчымасць абгрунтаваць сваю пазіцыю, якая для іншых дзеячаў лічылася спрэчнай. З гэтага можна зрабіць выснову, што выдаўцы і аўтары часопіса вялі палеміку з прадстаўнікамі іншых канфесій выключна на глебе дагматыкі, багаслоўскіх пытанняў і на тэму распаўсюджання новай уніі ў розных мясцінах Заходняй Беларусі [5, с. 30; 8, с. 11; 9, с. 2].

Такім чынам, можна зрабіць наступныя высновы і вылучыць асаблівасці часопіса «Да Злучэньня!». Часопіс «Да Злучэньня!» – класічнае канфесійнае выданне, дзе выдаўцом з'яўляўся рэлігійны орган, тэматычная скіраванасць выдання – канфесійная, мэтавая аўдыторыя – або вернікі-уніяты, або вернікі, якім, на думку выдаўцоў, трэба пераходзіць да ўніі. Адпаведна, змест матэрыялаў выдання раскрываў чытачам перавагі новай уніі як канфесіі, у якую варта перайсці беларусам. Мэта выдавецкай дзейнасці А. Неманцэвіча, як і мэта распаўсюджання неаўніі, паводле «Да Злучэньня!», заключалася ў прасоўванні ідэі аб'яднання беларусаў на фундаменце веры і рэлігіі, а не на грунце нацыянальных і палітычных ідэй, як гэта прапаноўвалі выдаўцы шэрагу праваслаўнай і рыма-каталіцкай прэсы. Хоць «Да Злучэньня!» прапаноўваў ідэі аб'ядання, але з акалічнасцю: на умовах падпарадкавання Рымскаму Папе. З умоў аб'яднання вынікае рэдакцыйная палітыка ў розным стаўленні да прадстаўнікоў іншых канфесій. Рэдакцыя часопіса часта ўступала ў палеміку з прадстаўнікамі рыма-каталіцтва і праваслаўя адносна пытання распаўсюджання неаўніі. Інструментам палемікі была рубрыка «Наш адказ», праз якую рэдакцыя вяла своеасаблівы дыялог з прадстаўнікамі іншых канфесій па пытаннях распаўсюджання царкоўнай уніі.


1. Верамееў, С. Ф. Антон Неманцэвіч. Святар і пакутнік / С. Ф. Верамееў. – Мінск : Альфа-кніга, 2023. – 50 с.
2. Да Злучэньня! – 1932. – № 1.
3. Да Злучэньня! – 1932. – № 3.
4. Да Злучэньня! – 1932. – № 4–5.
5. Да Злучэньня! – 1932. – № 9.
6. Да Злучэньня! – 1932. – № 11.
7. Да Злучэньня! – 1934. – № 7–8.
8. Да Злучэньня! – 1934. – № 10.
9. Да Злучэньня! – 1935. – № 2.
10. Туронак, Ю. Спробы адраджэння Уніяцкай царквы на Беларусі ў XX стагоддзі / Ю. Туронак // Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. – С. 430–449.



**Ким И.К.**


## АРХИВНЫЕ МАТЕРИАЛЫ О ПАРЛАМЕНТСКИХ ВЫБОРАХ 1935 И 1938 ГОДОВ В ПОЛЬШЕ


*Ключевые слова: Польша, режим санации, парламентские выборы 1935–1938 гг. в Польше, архивы, архивные материалы.*


В архивах территорий, входивших в состав межвоенного польского государства, имеется достаточно большой объём документальных материалов о парламентских выборах в Польше, которые были проведены в соответствии с апрельской конституцией 1935 г. Конституция была типологически авторитарной, ей соответствовало избирательное законодательство, по которому оппозиция практически лишалась возможности